Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

ФАКУЛЬТЭТ ГІСТОРЫІ І САЦЫЯЛОГІІ

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, КУЛЬТУРЫ

Зборнік навуковых артыкулаў

Гродна 2007

...стве, все еще разобщенном по сословному и религиозному признакам, не ... единства, что закреплялось существованием закрытых, элитарных ...ений. Однако в ходе общественной деятельности разобщенность ...жан постепенно преодолевалась. Общественные инициативы становились ...ными для все более широкого круга людей. Ни государство, ни ...мерческие структуры не доходили в то время еще до многих сфер ...деятельности городского населения. Тогда горожане брали дело в свои ... Их публичная жизнь становилась от того более полноценной, хотя она и ... выпускалась из-под строгого надзора местной царской администрации. ...тельность витебских общественных организаций была типичной и для ...их губернских городов.


Источники и литература

1. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 1416, Витебское губернское ...ление (1802–1917 гг.). – Оп. 2.
2. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 1416, Витебское губернское ...ление (1802–1917 гг.). – Оп. 6.
3. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 1430, Канцелярия Витебского ...данского губернатора. – Оп. 1.
4. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 2496, Витебская городская ...ва (1872–1921 гг.). – Оп. 1.
5. Отчет о действиях Общества Витебских сельских хозяев за 1903 г. – Витебск: ...олит. Подземских, 1905. – 150 с.
6. Витебские губернские ведомости. – 1902.
7. Витебские губернские ведомости. – 1904.
8. Шибеко, З.В. Минск: Страницы жизни дореволюционного города / З.В.Шибеко, ... Ф.Шибеко. – Минск: Полымя, 1990. – 352 с.



***С.А. Шыдлоўскі***
***(Полацк, ПДУ)***


## *УРБАНІСТЫЧНЫ АСПЕКТ КУЛЬТУРЫ БАВАЎ ПРЫВІЛЕЯВАНАГА САСЛОЎЯ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ*

Шляхта, прывілеяванае саслоўе Беларусі, з'яўлялася пераважна вясковым станам. Яе пранікненне ў культурную прастору горада выяўлялася найперш у сферы баваў і адпачынку. Можна вылучыць пэўныя локусы, дзе найбольш адчувалася гэтая прысутнасць у першай палове XIX стагоддзя.

Перадусім гэта кірмаш, традыцыйны пункт камунікавання розных саслоўяў і культур на землях Беларусі. Слова "кірмаш" у XIX стагоддзі азначала не толькі торг, але і гулянне, "прастольнае свята пры царкве, касцёле, манастыры". Звычайна кірмашы ладзіліся летам і восенню ў гадавыя святы [1, с. 234]. Кірмашы праводзіліся ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі [2, с. 103]. Свецкую атмасферу падчас ладжання, напрыклад, свіслацкіх кірмашоў сучаснікі параўноўвалі з карлсбадскай – па багаццю разнастайных формаў баўлення і шырокаму ўдзелу арыстакратыі [3, с. 35].

На кірмашы прыязджалі прыватныя тэатральныя антрэпрызы. Адбываліся цыркавыя дэманстрацыі з фокуснікамі, канатаходцамі, гімнастамі. Распаўсюджанай падчас кірмашоў формай баўлення часу былі касцюміраваныя танцавальныя вечарыны [4, с. 78-79]. Кірмашовыя імпрэзы вылучаліся масавасцю і сацыяльнай разнастайнасцю ўдзельнікаў. Кірмашы маглі супадаць са шляхецкімі выбарамі, кантрактамі, што яшчэ больш павялічвала памеры ўрачыстасцяў.

Кантракты, дзелавыя і гандлёва-фінансавыя імпрэзы, якія адбываліся штогод у буйных гарадах краю, збіралі "высокае" грамадства. Падчас сакавіцкіх кантрактаў у Мінску набывалі, прадавалі і арандавалі маёнткі, браліся і выплачваліся пазыкі ды адсоткі, замацоўваліся ўмовы на пастаўкі ў Рыгу хлеба, карабельнага лесу, пянькі, ільну, ільнянога семя і г.д. Акрамя таго, нанімаліся ў маёнткі эканомы, пісары, афіцыялы [5, с. 97]. Віленскія святаюр'еўскія кантракты з'яўляліся тым рэдкім момантам, калі ў край, каб сплаціць або атрымаць пазыкі, вярталася арыстакратыя, што знаходзілася звычайна за яго межамі [6, с. 7]. Да кантрактаў прымяркоўваліся тэатральныя і цыркавыя паказы, канцэрты, балі, званыя абеды.

Саслоўнымі асяродкамі баўлення вольнага часу з'яўляліся "дваранскія сабранні", куды перыядычна з'язджаліся шляхецкія сем'і з правінцыі на дваранскія выбары, тут жа адбываліся і розныя танцавальныя і касцюміраваныя вечары. Пазней іх функцыю часткова падмянілі клубы. Больш дэмакратычнымі зонамі баваў і адпачынку былі грамадскія паркі, бульвары, корчмы і шынкі, якія прадугледжвалі калі і не цалкам роўны ўдзел усіх саслоўяў, дык іх пасіўную глядацкую прысутнасць. Месцам, дзе магло бавіцца сацыяльна змешанае грамадства, былі таксама рэдутавыя залі.

Камерцыйныя танцавальныя вечарыны – рэдуты, што ладзіліся ў буйных гарадах краю на запусты, вымагалі ад удзельнікаў наяўнасці масак. Маска мусіла гарантаваць роўнасць у сацыяльна змешанай кампаніі адпачываючых, што адпавядала эканамічным інтарэсам арганізатараў рэдутаў, якія такім чынам заахвочвалі да ўдзелу ў вечарынах больш шырокае кола ўдзельнікаў (шляхту, купецтва, разначынную інтэлігенцыю). Акрамя таго маска стварала пэўныя авантурныя варункі ў адносінах палоў. Галоўнымі бавамі на рэдутах былі танцы і картачная гульня. Падчас вечара за асобную плату можна было набываць алкаголь [7, с. 150].

Вакол маскарадаў узнікала мноства легендаў. Мемуарысты распавядаюць пра містычныя здарэнні, звязаныя з маскарадамі, пра прароцтвы, якія адбываліся на іх, аб з'яўленні на маскарадах памерлых ды іншае. Але маскарад быў перадусім месцам нястрыманай весялосці, дзе дазваляліся рэчы, табуяваныя ў звычайных абставінах. Сучаснікі адзначалі паступовую дэградацыю маральнай атмасферы маскарадаў [8, с. 12]. Як піша граф Л.Патоцкі: "У Варшаве ў велізарных ярка асветленых маскарадных залах таўкуцца, пхаюцца, праціскаюцца тысячы масак. Турчанкі, індускі, цыганкі, яўрэйкі, негрыцянкі, немкі, шведкі, неапалітанкі, іспанкі, кракавянкі, узоры розных народаў побач з фантастычнымі выдумкамі міфалагічных багіняў, рознакаляровых

даміно. Паміж імі арлекін з каламбінаю, чараўнік з вяшчункаю, пілігрым з пілігрымкаю, пастушкі, літоўскія вайдэлоткі, русалкі, усе пад маскамі і кожная цябе зачэпіць, піша на руцэ іерогліфы або лічбы. Адна пытаецца, ці пазнаеш яе, другая заяўляе, што цябе кахае, іншая запрашае да сябе на заўтра, дае найчасцей выдуманы нумар дома. А тая просіць, каб яе пачаставаў марожаным, цукеркамі, вячэраю, а часам нават пончыкам...” [3, с. 92].

У Мінску на Высокім рынку ў доме Гейдукевіча адбываліся касіны, танцавальныя вечары, якія арганізоўваліся ў розны час, але асабліва шырока зімой – на Карнавал [4, с. 150]. У Вільні касіны ладзіліся пад ачолай Я.Ходзькі. Папулярным месцам для гэтых танцавальных збораў быў дом Мюлера. Зборы ад іх правядзення ішлі на карысць Дома Дабрачыннасці. Гулянні працягваліся да ўсходу сонца. Найбольш распаўсюджанымі танцамі на падобных вечарынах былі мазуркі і вальсы.

Баль, у адрозненні ад іншых танцавальных імпрэзаў, з’яўляўся рытуалізаванай дзеяй. У ім, як правіла, удзельнічалі людзі аднаго сацыяльнага кола. Ён быў важнай часткай механізма саслоўнай рэпрадукцыі прывілеяванага стану, неад’емным складнікам матрыманіяльных стратэгій арыстакратыі. Баль з’яўляўся месцам разнастайных камунікацый – ад любоўных да грамадска-палітычных [9, с. 76]. Гэта была тая пляцоўкай, дзе ўпершыню выяўляліся і замацоўваліся разнастайныя модныя тэндэнцыі. Балі праводзіліся ўвесь год, за выняткам часу пастоў. Галоўным бальным сезонам была зіма [10, с. 144].

Існавала традыцыя даваць грамадскія балі і абеды ў гонар шанаваных людзей або з нагоды пэўных падзеяў. Балі, што ладзіліся для каранаваных асобаў, узнімаліся да вышыняў мастацтва. Прыкладам могуць служыць балі, якія адбываліся ў Вільні на працягу 1812 года пачаргова ў гонар расейскага і французскага імператараў. Часткай гэтых дзеяў былі кантаты, спевы, іншыя формы глярыяфікацыі асобаў, якія ўшаноўваліся [11, с. 153].

Балі адкрываліся менуэтамі, а пазней – паланэзамі. Пасля паланэза звычайна пачыналася кадрыль. Існавалі нацыянальныя адметнасці гэтага танца – расейская, нямецкая, французская (кантраданс) ды польская. Наступным танцам з’яўляўся вальс. Галоўным танцам на бале ўважалася мазурка. Заканчваўся баль катыл’ёнам [12, с. 21-28]. Танцавалі на балях пад аркестр.

Пэўныя сем’і, што пераязджалі на зіму са сваіх маёнткаў у горад, трымалі так званыя “адкрытыя дамы”, у якія можна было патрапіць на званы абед ці вячэру амаль штодня або ў асобна вылучаны дзень. Падставамі падобнай гасціннасці былі або матрыманіяльныя разлікі, або палітычныя гледзішчы з увагі на будучыя шляхецкія выбары, або неабходнасць падтрымкі сацыяльнага прэстыжу, як гэта магло быць, напрыклад, з прадстаўнікамі царскай адміністрацыі.

Адной з прэстыжных формаў баўлення вольнага часу ў прывілеяванага саслоўя з’яўляўся тэатр. Тэатральная ложа была

своеасаблівай філіяй салону. Наведванне тэатру рабілася нагодай для дэманстрацыі модных строяў, навязвання свецкіх кантактаў.

Па дасціпнай заўвазе сучасніка, на правінцыі тэатральныя спектаклі замянялі публіцы судовыя паседжанні. Прамовы адвакатаў (глосы), выкладанне прэтэнзіяў (маніфесты) друкаваліся і распаўсюджваліся [5, с. 80]. Мясцовая адвакацкая школа вызначалася сваёй адукаванасцю і красамоўствам [11, с. 122].

Эпіцэнтрамі "моднага" жыцця летам рабіліся гарадскія бульвары, грамадскія паркі і сады, дзе ўвечары грала музыка, а на святы ладзіліся ілюмінацыі і феерверкі [4, с. 147]. Шпацыры на бульварах і ў садах дапаўняліся наведваннем трактыраў, у якіх пад час кантрактаў, святаў ды кірмашоў грала музыка. Жанчыны ўпадабалі цукерні, дзе можна было паспытаць шакалад, пачытаць прэсу.

Прыватныя сады, якія арандаваліся прадпрымальнікамі ці пераводзіліся ў ранг грамадскіх самімі гаспадарамі, таксама як і танцавальныя вечарыны (рэдуты), могуць служыць прыкладам далейшай камерцыялізацыі і прафесіяналізацыі культуры адпачынку ў першай палове XIX стагоддзя. Апошняе спрыяла дэмакратызацыі грамадскіх забавак, яны зрабіліся больш масавымі. Пры баўленні вольнага часу акрамя гледзішчаў прэстыжу, прывілеяванае саслоўе пачало звяртаць увагу і на карыснасць баваў для здароўя ды інтэлектуальнага развіцця.

Такім чынам, характар баўлення вольнага часу прывілеяваным саслоўем Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя не здолеў пазбегнуць трансфармацый, што выніклі з тэндэнцый урбанізацыі ды індустрыялізацыі грамадства.

Крыніцы і літаратура


1. Кісялёў, Г. Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" / Г.Кісялёў. – Мн.: Бел. навука, 2005. – 549 с.
2. Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917 г. : вучэбны дапаможнік/ І.І. Коўкель [і інш.]; hэдгал.: І.П.Крэнь, І.І.Коўкель. – Мн.: Аверсэв, 2001. – 400 с.
3. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л.Патоцкі. – Мн.: Полымя, 1997. – 270 с.
4. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М Шпилевский. – Мн., Юнацтва, 1992. – 251 с.
5. Булгарын, Ф. Выбранае / Ф.Булгарын. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2003. – 592 с.
6. Puzynina, G. W Wilnie i w dworach litewskich. Pamiętnik z lat 1815-1843 / G.Puzynina. – Krakow: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1990. – 389 s.
7. Kitowicz, J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. Wyd. 2 zmien / J.Kitowicz – Wroclaw, 1951. – 613 s.
8. Роткирха фон, В. Мертвец в маскараде / В. фон Роткирха [вступит. ст. и подготовка текста П. Лавринца] // Вечерние новости. – 1995. – № 2 (11045).
9. Яковкина, Н.И. Русское дворянство первой половины XIX века. Быт и традиции / Н.И.Яковкина. – СПб.: Лань, 2002. – 160 с.
10. Захарава, О.Ю. Светские церемониалы в России XVIII – начала XX в. / О.Ю.Захарава. – М. : ЗАО Центрполіграф, 2003. – 329 с.
11. Живописная Россия. Т. 3.: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. Воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Мн.: БелЭн, 1994. – 550 с.